# «Беларусы ў свеце»

***4 красавіка ў рамках творчай стажыроўкі кіраўнікоў замежных беларускіх непрафесійных калектываў мастацкай творчасці і кіраўнікоў грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа Мінск наведалі беларусы Аргенціны, Арменіі, Іарданіі, Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны і Эстоніі.***

З 2016 года Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур праводзіць творчыя стажыроўкі ў межах праграмы «Беларусы ў свеце», якія вельмі запатрабаваныя прадстаўнікамі беларускай дыяспары. Пад час іх ладзяцца майстар-класы па дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве, паглыблена вывучаюцца беларускія песні, танцы, абрады, традыцыі для далейшай папулярызацыі беларускай культуры сярод нашых суайчыннікаў за мяжой.

У красавіку гэтага года група прадстаўнікоў беларусаў замежжа наведала Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Для гасцей знаўца беларускай народнай культуры Яўген Сахута правёў адукацыйную экскурсію па выставе вырабаў майстроў народнай творчасці «Жывыя крыніцы». Яны паўдзельнічалі ў майстар-класах па дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве.




Яўген Сахута на выставе

Сваё майстэрства прадэманстравалі майстрыхі са Слуцка, Маладзечна, Беразіно. Кацярына Чарнышова з Маладзечанскага раённага цэнтра рамёстваў ужо дзевятнаццаць гадоў стварае ўпрыгожанні з саломкі. Наталля Матусевіч з Квасыніцкага цэнтра рамёстваў Слуцкага раёна пляце паясы, вырабляе лялькі і аплікацыі з белага золата. Лана Сласцён кіруе народным аматарскім калектывам «Вербачка» і займаецца вырабам посуду з лазы. Госці пазнаёміліся з упрыгожаннямі з бісеру Веры Пярмінавай і Алены Артынскай; агледзелі дэкаратыўныя пано ў тэхніцы мастацкіх роспісаў Ірыны Царашковай і Святланы Скавырка; ганчарны посуд Васіля Логвіна і Мікалая Стрэльчанкі; велікодныя пісанкі Вольгі Хачковай. Народны майстар Яўген Осіпаў з Беразіно паказаў, як рабіць драўляныя лыжкі.

Яўген Сахута паведаміў гасцям пра тое, як у Беларусі з 1990-х гадоў адраджаліся народныя рамёствы, вывучалася і даследавалася традыцыйная народная культура.

Сярод членаў дэлегацыі былі тры госці з Іркуцкай вобласці, якія цікавяцца традыцыйнай беларускай культурай. Яны набылі і сфатаграфавалі на памяць мастацкія вырабы на выставе для сябе і сваіх дзяцей. Пад час размовы высветлілася, што адна з іх, Ганна Ярылава, з'яўляецца нашчадкам беларускіх перасяленцаў, якія заснавалі вёску Марыінск у Іркуцкай вобласці.

*Эла ДЗВІНСКАЯ*